ВІНШУЕМ СА СВЯТАМ, НАШ АРДЭНАНОСНЫ МІНСК!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (671) ● ПЯТНІЦА, 26 мая 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

ПАДАРОЖЖА Ў 900 ГОД

Вабяць кожнага з нас вуліцы Мінска, яго тэатры, дамы культуры, музеі, зялёныя скверы. Многа непаўторных сваёй прыгажосцю мясцін ў юбіляра. Абыйсці ўсе іх, каб палюбавацца, не так проста: патрэбна не адна гадзіна, не адзін дзень, а нават тыдні. Але пазнаёміцца з горадам вы можаце... прачытаўшы вучэбную газету «Журналіст». Яе чарговы нумар студэнты-журналісты прысвячаюць 900-годдзю Мінска. Нумар прыцягвае увагу прыгожым афармленнем і разнастайным жанравым зместам матэрыялаў. Тут вы зможаце прачытаць цікавыя старонкі гісторыі юбіляра.

Дарэчы, каб больш глыбока і шматгранна расказаць пра гісторыю роднага горада, будучыя журналісты пабывалі ў многіх музеях, дзе ім удалося сабраць шмат цікавых фактаў, цяпер пра іх можна даведацца, чытаючы нумар. Многія замалёўкі, рэпартажы, карэспандэнцыі, інтэрв'ю расказваюць пра сённяшні Мінск, пра яго стваральную працу, людзей, культуру, дасягненне ў навуцы. Адным словам, прачытаўшы «Журналіст», вы зробіце цікавае падарожжа па сталіцы рэспублікі.

Хочацца павіншаваць маладых журналістаў з вялікім творчым поспехам.

І. ШВЕДАЎ.

Гераічныя стагоддзі

КВІТНЕЙ, ЮБІЛЯР!

ГОРАД НАШ! ПРАЖЫЎ ТЫ ЛІХАЛЕЦЦЕ.
ГОРАД НАШ! ТЫ—НАШАЕ БЯССМЕРЦЕ.
УЗРАСТАЙ НА РАДАСЦЬ НАМ І ДЗЕЦЯМ
І ШУМІ ТЫ СЛАВАЮ НА СВЕЦЕ!

Пятрусь БРОЎКА.

Мінск у святочных сцягах. Мінск дэманструе свае дасягненні ў працы, прамысловасці, адзінства і згуртаванасць беларусаў з усімі братнімі народамі Савецкага Саюза. вакол Камуністычнай партыі і Савецкага урада. Сёння мы з'яўляемся сведкамі вялікага росквіту беларускага народа, як і ўсіх народаў СССР.

Сённяшні Мінск — гэта буйнейшы індустрыяльны цэнтр, горад навукі, вялікай культуры. З кожным днём ён становіцца ўсё большым, шырэйшым, раздаецца ў плячах, нібы волат, якога бязмернай сілай надзяліла родная маці-Беларусь.

Пасляваенныя гады паказалі, на што здольны мінчане ва ўмовах мірнай стваральнай працы. Яны паднялі з руін свой родны Мінск, ператварылі яго ў горад-прыгажун, у горад будаўніцтва, першакласнай сучаснай прамысловасці, у горад навукі і культуры. З кожным годам у Мінску вырастаюць новыя заводы і фабрыкі, кварталы і мікрараёны, дзе створаны ўсе ўмовы для шчаслівага жыцця. І мы, мінчане, радуемся, гледзячы на гэты імклівы рост роднай сталіцы.

Родны Мінск, уся Беларусь шчыра дзеліцца ўсімі лепшымі дасягненнямі сваёй навукі і творчасці з усімі братнімі народамі нашай многанацыянальнай дзяржавы і ўсяго свету. Цяпер цяжка адшукаць той куток краіны, дзе б не працавалі выпускнікі навучальных устаноў горада Мінска і ў тым ліку нашага універсітэта. Мала таго, выпускнікоў з ромбікамі БДУ імя У. І. Леніна можна сустрэць і ў замежных краінах. У хуткім часе такія значкі, як сімвал выдатных дасягненняў беларускай навукі, будзе насіць моладзь з 16 краін свету.

Давайце хоць на некалькі мінут заглянем у мінулае і паглядзім, кім мы былі раней і кім сталі цяпер. Універсітэт наш — дзецішча Савецкай улады. З яго адкрыццём упершыню юнакі і дзяўчаты змаглі пасапраўднаму прыступіць да штурму ведаў. Студэнты тых гадоў ведалі: каб будаваць шчаслівае жыццё, будаваць яго паспяхова, неабходна ўзброіцца навукай. У 1921 годзе, годзе адкрыцця БДУ было толькі два факультэты, а сёння іх дзевяць. Наш універсітэт — гэта альмаматэр такіх выдатных навучальных устаноў Мінска, як Політэхнічны інстытут, Медыцынскі, Педагагічны, Інстытут народнай гаспадаркі.

Кожную раніцу беларускае радыё пачынае сваю перадачу словамі гімна: «Мы, беларусы, з братняю Руссю разам шукалі к шчасцю дарог...» Так, гэтыя шляхі мы шукалі поплеч з усімі братнімі народамі, гэтыя шляхі нам адкрыла родная Камуністычная партыя, па гэтых шляхах ідуць сёння мінчане, усе беларусы.

Кожны з нас непамерна радуецца, гледзячы на новыя кварталы шматпавярховых дамоў, цудоўныя скверы, паркі, плошчы. З кожным днём гмахі Мінска растуць увысь і ўшыр. Дзе яшчэ ўчора ляніва на сонцы ляжалі голыя каменні— сёння паднімаюцца будынкі новага квартала. А назаўтра тут ўжо святкуюць навасэлле шчаслівыя мінчане. Такая ўжо дыялектыка Мінска — расці і расці, набіраць усё больш і больш моцы.

Квітней, наш любімы горад, прыгажэй з кожным днём! Няхай незлічонымі будуць твае стагоддзі!

Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола і прафком сардэчна віншуюць прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў, рабочых і служачых з вялікім святам — 900-годдзем Мінска і заклікаюць паўсядзённа памнажаць яго славу.

ДЗЕНЬ АФРЫКІ

Днямі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва свету адсвяткавала Дзень вызвалення Афрыкі. У Беларускім Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны гэтай знамянальнай падзеі. Актыўны ўдзел у ім прынялі студэнты замежных краін, якія навучаюцца ў нашым універсітэце. Многія з іх у выступленнях расказалі аб барацьбе за незалежнасць усяго афрыканскага кантыненту, аб веры ў светлае будучае Афрыкі, выказалі словы шчырай падзякі савецкаму народу за бескарыслівую дапамогу ў эканамічным развіцці іх краін, за бацькоўскія клопаты выкладчыкаў БДУ імя У. І. Леніна, якія прыкладаюць шмат намаганняў для таго, каб замежныя студэнты пасля заканчэння універсітэта былі высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

С. ІВАНОЎ.

ВІД НА ПЛОШЧУ У. І. ЛЕНІНА

Фота А. Кадзета.

УСЕСАЮЗНЫ СІМПОЗІУМ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце 23 мая пачаў сваю работу другі Усесаюзны сімпозіум па праблеме гісторыі азёр пауночнага захаду СССР.

Беларусь—азёрная рэспубліка. Вывучэнне азёр набывае ўсё большае значэнне ў сувязі з хуткім асваеннем прыродных багаццяў чалавекам, іх аховай.

Каля ста вучоных, якія з'ехаліся ў Мінск з Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў краіны, заслухаюць і абмяркуюць каля 50 навуковых дакладаў, зробяць экскурсіі ў Бярэзінскі запаведнік, на Ушацкія азёры і возера Нарач.

Вялікі ўклад у археалагічныя раскопкі сталіцы уносяць выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта. Гэтым самым яны дапамагаюць з марксісцка-ленінскіх пазіцый асвятляць гістарычны працэс развіцця беларускай нацыі, важнейшых падзей і фактаў яе гістарычнага мінулага. Вучоныя гістфака БДУ унеслі вялікі ўклад у стварэнне двухтомнай гісторыі Беларусі.

На здымках: за гэтымі варотамі ўпыліся мінчане у 1067 годзе (верхні здымак).

Макет сядзібы Мінска XII стагоддзя, зроблены студэнтамі гістфака М. Курганавым і В. Якубоўскім. Работа адобрана на рэспубліканскі агляд наглядных дапаможнікаў (здымак справа).

ВУЧОНЫЯ УНІВЕРСІТЭТА МІНСКУ

Навука! Яна некалі для працоўнага чалавека была за сямю замкамі. Савецкая ўлада дэмакратызавала яе, зрабіла народнай, падпарадкавала практычным мэтам і задачам усяго грамадства. Партыя зрабіла яе яркім факелам, які павінен асвятляць шлях тым, хто настойліва і ўпарта ідзе па дарогах невядомага.

Міжвольна адчуваеш гордасць, што ў нашага народа ёсць свой цэнтр навукі. Адчуваеш гордасць за тое, што ты жывеш у горадзе, дзе побач з табой жывуць і працуюць вучоныя, якія сваёй стараннай працай абагачаюць жыццё, якія даюць пачатак і прастор таму, што прыносіць чалавецтву незлічоныя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

Цяпер, дзе б толькі не прышлося пабываць, вы абавязкова сустрэнеце сляды працы вучонага ардэнаноснага БДУ імя У. І. Леніна — чалавека з універсітэцкім значком-ромбікам і пачуеш ад яго словы ўдзячнасці сваім настаўнікам. Сярод яго выпускнікоў — вучоныя, партыйныя і грамадскія дзеячы, работнікі навукі і мастацтва, вядомыя ў народзе і паважаныя ўсімі людзьмі: фізікі, матэматыкі, біёлагі, хімікі, філолагі, журналісты, геолагі, гісторыкі, юрысты, географы і іншыя высокакваліфікаваныя спецыялісты.

Наш універсітэт закончылі народны пісьменнік БССР, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР Кандрат Крапіва, народны паэт БССР, лаўрыят Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка, паэт і акадэмік Пятро Глебка. Вучоныя універсітэта далі выдатную ідэйную і тэарэтычную падрыхтоўку празаіку Кузьме Чорнаму, паэту Паўлюку Трусу. Выхаванцам універсітэта з'яўляецца міністр замежных спраў А. Грамыка. Вучоныя універсітэта падрыхтавалі для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навуковых устаноў сталіцы і усёй краіны многіх дактароў і кандыдатаў навук, якія паспяхова зараз перадаюць свае багатыя веды моладзі.

Вось, напрыклад, кандыдат філалагічных навук Іван Навуменка. Ён пасля вайны скончыў універсітэт. Займаўся ў аспірантуры, выдатна абараніў кандыдацкую дысертацыю, паспяхова чытае курс беларускай літаратуры. Яго з вялікай цікаўнасцю слухаюць студэнты. Літаратура— яго любімы прадмет. Ён сам з'яўляецца вядомым беларускім празаікам. Такіх, як Іван Навуменка, на ўсіх факультэтах, па ўсіх спецыяльнасцях нямала. Учарашнія рабочыя і калгаснікі становяцца вучонымі, інжынерамі, настаўнікамі — гэта заканамерны працэс для нашага савецкага жыцця.

Вучоныя універсітэта — гэта дзеці працоўнага народа і таму яны заўжды стараюцца як мага больш зрабіць для народа. Многім мінчанам вядома імя Івана Мікалаевіча Лушчыцкага. Яго студэнты ласкава называюць «наш прафесар». І на самай справе, ён сам з гушчыні народа, яго галоўныя клопаты, каб увесь народ быў адукаваным, каб ён будаваў сваё грамадства не стыхійна, а з вялікім ўсмедамленнем, упэўнена.

За гады сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці прафесар падрыхтаваў дзесяткі вучоных.

У розных інстытутах рэспублікі плённа працуюць вучні доктара філасофскіх навук члена-карэспандэнта АН БССР В. І. Сцяпанава, а таксама іншых буйных вучоных універсітэта, якімі ганарыцца Мінск.

А вось яшчэ адзін ветэран універсітэта — загадчык кафедры эксперыментальнай фізікі і фізічнай электронікі Ілья Рыгоравіч Некрашэвіч.

Ва універсітэце амаль усе добра ведаюць гістарыю з ампулай радыя. Яна патрэбна для практычных заняткаў. Гэта наогул каштоўная рэч, а калі ўлічыць тое, што з ёю здарылася, то яна становіцца яшчэ дарагейшай. Так здарылася, што Ілья Рыгоравіч не паспеў эвакуіравацца з акупіраванага фашыстамі Мінска. У тыя суровыя дні ён прыйшоў ва універсітэт і наняўся на працу вартаўніком. Але ён не проста быў вартаўніком. Некрашэвіч— падпольшчык з групы Героя Савецкага Саюза Марыі Барысаўны Осіпавай. І прыйшоў ён ва універсітэт не проста вартаўніком. Ён прыйшоў, як мсціўца, як падпольшчык, з заданнем вынесці з універсітэта рэчы, патрэбныя партызанам і падпольшчыкам. Перш за ўсё ён вынес ампулу з радыем. У той час гэта было незвычайнай каштоўнасцю. Ён насіў яе ў кішэні, не звяртаючы ўвагі на тое, якую шкоду можа прынесці гэта яго здароўю. Ілья Рыгоравіч наносіў на карту ваенныя аб'екты ворага ў Мінску, на якія пасля сыпаліся бомбы з нашых самалётаў. Так, рыскуючы штодзённа жыццём, будучы прафесар помсціў фашыстам за здзекі над нашай навукай, за перарванае мірнае жыццё савецкіх людзей. Цяпер, чытаючы лекцыі ва універсітэце, Некрашэвіч дэманструе студэнтам тую ампулу радыя, якую ён выносіў пад сэрцам. Сціпласць не дазваляе яму расказваць гісторыю гэтай ампулы. Ну, а калі б ён расказаў пра яе сваім слухача, яны б праніклися яшчэ большай павагай да нашай навукі, да яе прадстаўнікоў, людзей, якія пасапраўднаму адданы нашаму грамадству, якія ішлі ў імя яго на смяротныя бітвы, на вялікія подзвігі, якія з'яўляюцца гордасцю Мінска.

Старажытны Мінск стаў радзімай нашага універсітэта, які з гонарам носіць імя У. І. Леніна. Мінск даў яму і першых выкладчыкаў. Ён быў разам з ім у дні цяжкіх выпрабаванняў, дапамагаў і дапамагае ўпэўнена крочыць да ўсё большых і большых поспехаў у развіцці савецкай навукі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. І наш ардэнаносны універсітэт не застаецца і ніколі не застанецца ў даўгу перад Мінскам.

А. БЯСПАЛЫ.

ГЕРОІ—ПОРУЧ З НАМІ

У дзень святкавання юбілею нельга не ўспомніць тых, хто са зброяй у руках змагаўся за вызваленне Мінска, усяго савецкага народа, хто застаўся ў акупіраваным фашыстамі горадзе, каб у глыбокім падполлі змагацца супроць смяротнай навалы. Не памылюся, калі скажу, што Мінск з'яўляецца горадам герояў. Гэта сапраўды так. Біяграфіі бясстрашных людзей нам добра вядомы. Пазнаёміцца бліжэй з імі вы зможаце хоць бы, напрыклад, на фізічным факультэце, дзе створан выдатны стэнд «Героі Савецкага Саюза — нараджэнцы Мінска і Мінскай вобласці». З цікавасцю спыняешся ля яго, чытаеш біяграфіі тых, хто праявіў мужнасць і гераізм у баях за вызваленне Радзімы ад нямецкага фашызму. Са стэнда глядзяць твары герояў. Адны радасна ўсміхаюцца, другія сур'ёзныя і задумёныя. Так і вырываецца міжвольна з грудзей ім шчырая падзяка: «Дзякуй вам, нашы дарагія бацькі, за жыццё якое вы падаравалі нам, за радасць, за вясну, за кветкі...»

Чытаеш імёны: Героі Савецкага Саюза Захараў Іван Кузьміч, Казачэнка Мікалай Міхайлавіч, Козіч Іван Сямёнавіч, Траян Надзея Віктараўна, Сцямпкоўская Алена Канстанцінаўна...

Стэнд «Героі Савецкага Саюза — нараджэнцы Мінска і Мінскай вобласці» — выдатнае пачынанне фізічнага факультэта па ўшанаванню памяці вялікіх людзей народа, яно заслугоўвае самай шырокай падтрымкі, з'яўляецца яшчэ адным яркім прыкладам выхавання нашай моладзі на гераічных традыцыях старэйшага пакалення.

А. ЦЕРАХОВІЧ.

ВЫДАТНЫ ПАДАРУНАК

У наш час бурна развіваюцца ўсе галіны навукі, расце аўтаматызацыя і мадэрнізацыя вытворчасці, якая з кожным днём патрабуе вырашэння складаных матэматычных задач. Вучоныя матфака нашага універсітэта ўносяць значны ўклад у развіццё праблем ядзернай фізікі, касманаўтыкі, кібернетыкі, хіміі і многіх іншых навук. Асабліва вялікі ўклад вучоных, інжынераў у стварэнне вылічальных машын «Мінск», а цяпер рэканструіраванай, дапоўненай новымі выдатнымі якасцямі «Мінск-22» — гэта выдатны падарунак матэматыкаў ардэнаноснаму Мінску, усёй краіне. Дарэчы, падарунак не абмяжоўваецца толькі тым, што супрацоўнікі БДУ прынялі актыўны ўдзел у стварэнні «электроннага мозгу», вылічальны цэнтр універсітэта рыхтуе кадры для вылічальных устаноў, заводаў, фабрык, сельскай гаспадаркі.

Цяпер у Мінску няма ніводнага навуковага інстытута, дзе б не працавалі выхаванцы матэматычнага факультэта. Без вылічальнай машыны проста немагчыма далейшае развіццё вытворчасці, яго ўдасканаленне.

Важнае значэнне набывае таксама і ўдасканаленне размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў нашай сталіцы і рэспублікі. Электронныя машыны «Мінск-22» і высокакваліфікаваныя інжынеры-вылічальнікі, якіх рыхтуе універсітэт, уносяць свой уклад і ў вырашэнне гэтай задачы. Яны аказвалі і аказваюць розным праектным арганізацыям вялікую дапамогу ў выкананні важнейшых народнагаспадарчых планаў.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

ХРОНІКА. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ.

● *У навуковых установах і вышэйшых навучальных установах Мінска працуе 10 363 навуковых работнікаў, у тым ліку 203 дактары навук і 2369 кандыдатаў навук.*

● *Плошча зялёных насаджэнняў агульнага карыстання ў Мінску складае 848 га, або 11,5 кв метраў на аднаго жыхара.*

● *Прамысловасць Мінска дае каля 1/3 усёй прамысловай прадукцыі Беларусі і 20 працэнтаў аўтаматычных ліній краіны.*

● *Гадавая прадукцыя прадпрыемстваў толькі аднаго Завадскога раёна Мінска ў пяць разоў больш аб'ёма прамысловай прадукцыі ўсіх прадпрыемстваў Беларусі ў дарэвалюцыйны час.*

● *Гітлераўскія захопнікі знішчылі ў Мінску 932 цагляных будынкі і 3 154 драўляных, або 80 працэнтаў жылога фонда горада. Цяпер жылы фонд у горадзе ў пяць разоў большы, чым у 1940 годзе.*

СЁННЯШНІ МІНСК



ГОРАД НА СВІСЛАЧЫ

ЗЯКОГА б боку мы не ўязджалі ў Мінск, са Слуцка або Масквы, з Ракава ці Брэста, з Лагойска або Гомеля, адразу кідаюцца ў вочы новабудоўлі горада. Так, вежавыя краны і рыштаванні сталіцы нашай рэспублікі з'яўляюцца яе адметным тварам. Кожнаму прыезджаму адразу кінуцца ў вочы характэрныя рысы маладога горада.

Цяжка ў цяперашнім Мінску бачыць горад, якому споўнілася 900 год і гісторыя якога пачыналася з невялічкага паселішча на правым беразе ракі Свіслач, там, дзе Нямігa ўпадала калісьці ў поўнаводную раку.

Нездарма горад узнік на гэтым месцы, тут, на паўднёвых схілах Мінскага ўзвышша, адкуль цякуць рэкі, што нясуць свае воды на поўдзень і захад. Калі спусціцца ўніз па цячэнню ракі Свіслач, то можна трапіць у Днепр, а адтуль у Чорнае мора. Калі ж мы задумалі трапіць у Балтыйскае мора, то варта было б пайсці ўверх па цячэнню Свіслачы, адтуль перайсці да рэчкі Ушы і паплысці да Нёмана.

Праязджаючы ў Маскву або цэнтральныя раёны Расіі, заходнееўрапейскія купцы не маглі абмінуць Мінска. А едучы з Кіева ў Полацк або ў Ноўгарад, яны таксама заглядалі ў Мінск. Вось чаму горад хутка ператвараўся ў цэнтральны горад Беларусі, даволі буйны населены пункт.

Сем разоў горад разбураўся захопнікамі: татарамі і шведамі, палякамі і французамі, але кожны раз ён зноў паднімаўся з руінаў і пажарышч, а жыхары Мінска і Беларусі адбудоўвалі яго яшчэ больш прыгожым.

1793 год. Мінск далучаецца да Расіі, а праз тры гады ён становіцца цэнтрам Мінскай губерніі. І ўсё ж гэта невялікі, драўляны горад, насельніцтва якога занята рознымі рамёсламі і гандлем. «Горад асвятляецца газай», — чытаем мы ў дарэвалюцыйнай энцыклапедыі пра Мінск. А гэта ўжо пачатак XX стагоддзя. 548 газавых ліхтароў асвятлялі горад у 1895 годзе.

Пабудова Маскоўска — Брэсцкай і Лібава—Роменскай чыгунак некалькі ажывіла горад, дала яму штуршок для далейшага развіцця. І ўсё ж да Кастрычніцкай рэвалюцыі Мінск вызначаўся сваімі вінакурнямі, абойнымі фабрыкамі, механічнымі млынамі, абутковымі прадпрыемствамі. Горад гандляроў і рамеснікаў.

Адзіным транспартам у горадзе была «конка», пушчаная ў 1894 годзе па Захар'еўскай вуліцы (цяпер праспект імя Леніна). На адукацыю кожнага грамадзяніна траціласа ў год 50 капеек.

Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая дала беларускаму народу права «людзьмі звацца», дала дзяржаўнасць, узнесла да новага жыцця сталіцу Савецкай Беларусі. Нельга ў некалькіх радках апісаць тыя вялікія змены, якія адбыліся ў горадзе за кароткі даваенны час. Горад дробных прадпрыемстваў і рамеснікаў стаў горадам механізаваных заводаў і фабрык, якія пачалі вырабляць самыя складаныя машыны. Калі ў 1914 годзе ў горадзе было ўсяго 69 прамысловых прадпрыемстваў, то ў 1940 годзе больш 330, а прамысловая прадукцыя за гэтыя гады выросла больш, як у 40 разоў. А якімі шпаркімі тэмпамі развівалася навука. Было створана дзесяць вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку і Беларускі дзяржаўны універсітэт, АН БССР, шмат тэхнікумаў, даследчых інстытутаў.

Але на долю Мінска выпала яшчэ адно выпрабаванне, якое горад мужна перанёс. Вайна з фашысцкімі захопнікамі дорага абыйшлася гораду: каробкі згарэўшых дамоў, разбураныя фабрыкі і заводы, поўнасцю знішчаныя транспарт, вадаправод, каналізацыя, бальніцы, школы — вось, што ўбачылі воіны Савецкай Арміі, вызваліўшыя родны горад. З 320 тысяч жыхароў даваеннага Мінска засталося толькі каля 50 тысяч.

І зноў ужо не толькі адна Беларусь, але і ўся краіна адбудоўвае горад. Здавалася, не хопіць сіл, каб падняць горад, утоптаны варварскім ботам у гразь, здавалася, лягчэй пабудаваць горад на новым месцы. Але воля і настойлівасць беларускага народа неадольныя. Паступова разбіраліся руіны, а на іх месцы нараджаліся новыя гмахі. Ажывіліся драмаўшыя акраіны, тут пачалі будаваць трактарны і аўтамабільны заводы, камвольны камбінат. І хутка першыя трактары зыходзяць з канвеера завода, пабеглі машыны з зубрам на радыятары па дарогах краіны.

Цяпер нам здаецца дзіўным, што ў 1950 годзе ў горадзе было толькі восем маршрутаў аўтобусаў, сем загарадніх ліній, пушчаны першыя тралейбусы па маршруту Вакзал—парк Чэлюскінцаў.

Прайшло крыху больш, як дваццаць год пасля вайны. Не пазнаць Мінска і яго прамысловага аблічча.

Яшчэ ў 1950 годзе было выпушчана толькі 829 трактараў і многа аўтамабіляў, а ў бягучым годзе краіна атрымае каля 78 тысяч трактараў «Беларусь». Палі Кубы і Малі, Польшчы і Індыі, Гвінеі і Манголіі і іншых краін апрацоўваюць трактары Мінскага трактарнага завода. Заслужылі павагу і беларускія волаты-самазвалы, якія працуюць і ў спякотнай гарачыні Егіпта і на Далёкай поўначы. Нездарма на сусветнай выстаўцы ў Бруселі яны атрымалі вышэйшую ўзнагароду «Гранд-прыз». А хто не ведае мінскіх гадзіннікаў, якія ахвотна купляюць больш чым у сарака краінах свету? Або нашых аўтаматычных ліній. Бадай, не пералічыш усяго.

Мінск—можна смела сказаць — горад студэнцтва і творчай моладзі. Амаль сёмая частка насельніцтва яго — студэнты. І не дзіўна, бо ў горадзе 12 вышэйшых навучальных устаноў, шмат тэхнікумаў, прафесіянальна-тэхнічных вучылішч.

Пра «маладога» юбіляра можна пісаць многа і, бадай, нельга напісаць усяго. Хочацца толькі сказаць, што даволі многа падарожнічаючы па краіне і многа гарадоў пабачыўшы, заўсёды цягнула да сябе нейкая прыгажосць вуліц і плошчаў Мінска, яго велічнасць. І той, хто хоць раз пабывае ў нашай гасцінай сталіцы, заўсёды павязе ў сэрцы часцінку прыгажосці горада, нейкую тугу, якая будзе неадольна цягнуць назад, каб вярнуцца яшчэ раз сюды.

П. РОГАЧ,
аспірант геолага-геаграфічнага факультэта.

З ІМЕМ ЛЕНІНА

За мужнасць і гераізм, самаадданую партызанскую барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі працоўных горада Мінска ў гады Вялікай Айчыннай вайны і за поспехі, дасягнутыя ў аднаўленні горада і развіцці народнай гаспадаркі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў сталіцу нашай рэспублікі ордэнам Леніна. З імем Леніна звязана гісторыя Беларускага універсітэта, многіх іншых навучальных устаноў і прадпрыемстваў. Леніну, Камуністычнай партыі ўдзячны за сваё шчасце ўсе мінчане, увесь беларускі народ.

Няўрымслівае студэнцтва нашага універсітэта праяўляе вялікія клопаты дзеля добраўпарадкавання сталіцы рэспублікі. Штогод восенню і вясною сотні іх выходзяць на вуліцы, скверы, паркі, каб пасадзіць ці дагледзець «зялёнага друга». Асаблівае старанне тут праяўляюць хімікі. Восенню мінулага года яны арганізавалі некалькі факультэцкіх нядзельнікаў, у час якіх пасадзілі паабапал вуліц Мінска сотні дрэў.

Наш фотакарэспандэнт Ю. Мароз зазняў групу хімікаў на адной з вуліц у час працы па азеляненню Мінска.

ЯНЫ ЗАКОНЧЫЛІ ЮРЫДЫЧНЫ

«Яны закончылі юрыдычны» — гэтыя словы выклікаюць хваляванне і нейкую зайздрасць шчасліваму лёсу тых, хто атрымаў выдатную тэарэтычную і практыкную падрыхтоўку юрыста ў нашым універсітэце. Выпускнікі юрфака ўпісалі слаўную старонку ў развіццё законадаўства рэспублікі. Супрацоўнікі кафедры крымінальнага права БДУ І. І. Гарэлік, М. Н. Меркушаў, І. С. Цішкевіч, В. А. Шкурко прымаюць актыўны ўдзел у рабоце кансультацыйнага савета, які створаны пры Вярхоўным Судзе БССР. Пастаянна падтрымліваюць цесныя сувязі з органамі суда і пракуратуры і многія іншыя выкладчыкі юрфака. Дый у гэтых установах куды ні глянь — усюды выпускнікі юрыдычнага: С. Т. Шардыка (Старшыня Вярхоўнага Суда БССР), А. Г. Бондар (пракурор Беларускай ССР, дзяржаўны саветнік юстыцыі першага класа), М. Г. Ганчарэнка, П. Ю. Ждановіч, В. Т. Калмыкаў і іншыя (члены Вярхоўнага Суда БССР).

В. С. Смірноў — Старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Пералік можна працягваць бясконца, бо амаль у кожнай установе, на прадпрыемствах працуюць выпускнікі юрыдычнага.

І. КАЦ.

І МІНЧАНЕ



Фота А. КАДЗЕТА.

ЗАГЛЯНЕМ У ДЗЕНЬ ЗАЎТРАШНІ

Інстытут «Мінскпраект» распрацаваў новы генеральны план развіцця Мінска, выкананне якога разлічана да 1980 года. Па фактарах, якімі вызначаецца градабудаўніцтва — па прамысловасці, энергетыцы, навукова-даследчых установах, — мяркуецца, што за гэты перыяд колькасць жыхароў горада сумесна з бліжэйшымі прыгарадамі значна павялічыцца.

Генеральны план сталіцы, зацверджаны летась урадам БССР, істотна пераглядае архітэктурна - планіровачны прынцып яе забудовы. Асноўнай структурнай адзінкай прынята лічыць жыллёвы раён, які складаецца з мікрараёнаў. Планам прадугледжана пабудова 33 такіх раёнаў, размясціўшы ў іх ад 25 да 50 тысяч жыхароў. Гэта дазволіць павялічыць жыллёвы фонд горада прыкладна ў 2,5 разы.

Значна пашырыцца будаўніцтва культурна-бытавых, лячэбных, школьных і дашкольных устаноў. Узнікнуць буйныя комплексы шматпрофільных і спецыялізаваных бальніц, прадпрыемстваў гандлю, быту і камунальных паслуг, а таксама палацаў культуры, клубаў, кінатэатраў, бібліятэк. Рэзервуецца тэрыторыя для будаўніцтва заалагічнага саду, вялікіх спартыўных компексаў, рэспубліканскай выстаўкі народнай гаспадаркі.

Паралельна з гэтым будуць весціся работы па заканчэнню існуючых і фарміраванню новых архітэктурных ансамбляў горада. Поўнае завяршэнне атрымае Ленінскі праспект і прылягаючыя да яго плошчы. Плошчу Леніна ўвянчае 16-павярховы корпус педагагічнага інстытута імя М. Горкага, які стане архітэктурным акцэнтам усяго ансамбля. Вышынны будынак і прыбудова да музея Вялікай Айчыннай вайны зоймуць у бліжэйшыя гады сваё месца на Цэнтральнай плошчы. У комплексе з ёю будзе завершана рэканструкцыя плошчы Свабоды, дзе заглядае ўжо ў неба корпус інстытута «Белдзяржпраект».

Парадуе мінчан Паркавая магістраль, прабіўка якой ідзе да Заслаўскай шашы. Яна будзе таксама звязана з Магілёўскай шашой і ўтворыць другі гарадскі дыяметр. На новай магістралі ствараецца другі архітэктурны ансамбль. У яго ўвойдуць пабудаваны Палац спорту, 12-павярховая гасцініца «Інтурыст», якая будуецца, Дом мадэлей. Мяркуецца пабудаваць і другую ж такую гасцініцу, тры вышынныя грамадскія будынкі і некалькі 9—12-павярховых дамоў. Раёны, што суседнічаюць з магістраллю, будуць выкарыстаны пад жыллёвае будаўніцтва.

Непазнавальнай стане Магілёўская шаша. Пры выхадзе з цэнтра горада яе ўпрыгожаць шматпавярховыя дамы і вытворча-лабараторныя карпусы. Істотна зменіць свой воблік і раённая плошча. Да яе прымкнуць 14-павярховая гасцініца, буйнейшы ў горадзе універмаг, Палац культуры. На шашы з'явяцца і такія істотныя навіны, як высотны будынак Інстытута народнай гаспадаркі, такі ж па вышыні інтэрнат трактарнага завода, школа-рэстаран і іншыя збудаванні. Магістраль ператворыцца ў найпрыгажэйшую артэрыю горада.

Зайздроснае будучае чакае галоўную частку Ленінскага праспекта, які бярэ пачатак з магістралі Масква — Мінск. Тут на месцы вёскі Вялікая Слепня ўстане жылы раён, забудаваны 9—16-павярховымі дамамі. А на супрацьлеглым баку праспекта мяркуецца ўзвесці мемарыяльны помнік, рэспубліканскую выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі і пабудаваць заапарк...

У канцы перыяду, на які разлічан цяперашні генеральны план, узнікае неабходнасць зняць трамвайныя лініі з вуліц Даўгабродскай, Ульянаўскай, Якуба Коласа.

Не забыта ў генеральным плане і наша абмялелая Свіслач. Яна атрымае дадатковы водны паёк і зменіць свой рэжым: разальецца возерам ля пасёлка Дразды, пацячэ ў Сляпянскі ручэй, напоіць водасховішчы ў раёне парка Чэлюскінцаў і Зялёнага луга.

Погляд у будучае радуе і натхняе сэрцы людзей. Яны ведаюць: усё, што сёння запланавана, заўтра здзякуючы клопатам мудрай ленінскай партыі, будзе здзейснена. Наш слаўны Мінск стане яшчэ больш велічным, магутным і прыгожым.

П. ГЛЕБКА.
студэнт-завочнік.

НАШАЙ КАМСАМОЛІІ ЎПЭЎНЕНЫЯ КРОКІ

ВЕЛІЧНЫМІ справамі сустракае камсамолія універсітэта 900-гадовы юбілей сталіцы. Кожная група рыхтуе свой дастойны падарунак юбілею. У кожнай пярвічнай ячэйцы адчуваецца творчы пад'ём. Вядома, найлепшым падарункам сталіцы будзе паспяховая здача экзаменаў. Камсамольцы гэта разумеюць выдатна. Зайдзіце сёння ў лабараторыі, аўдыторыі, кабінеты пасля двух гадзін дня: студэнты настойліва рыхтуюцца да надыходзячай сесіі. Не здарма ж універсітэт называюць кузняй кадраў. З яго сцен выйшлі такія вядомыя людзі, як нашы паэты і пісьменнікі П. Броўка, І. Мележ, К. Крапіва; універсітэт дае цэлы атрад камсамольскіх работнікаў. Сярод іх першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. Жабіцкі, сакратар ЦК Р. Піонава, сакратары абкомаў, гаркомаў і райкомаў партыі і камсамола. Былы камсамолец універсітэта П. Леановіч працуе цяпер начальнікам управлення геалогіі пры Савеце Міністраў БССР, Ф. Марцінкевіч — член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар Інстытута эканомікі АН БССР...

Тысячы спецыялістаў, сотні партыйных і палітычных дзеячоў, тысячы кіраўнікоў прадпрыемстваў, вну, школ даў універсітэт рэспублікі і Саюзу. У гэтым ёсць вялікая заслуга і камсамола, памочніка рэктарата ў падрыхтоўцы высококваліфікаваных спецыялістаў.

І сёння на прадпрыемствах горада працуе каля 40 камсамольскіх няштатных лектараў і прапагандыстаў, каля 20 чалавек няштатнымі інструктарамі райкомаў камсамола. Камсамольцы універсітэта вядуць вялікую выхаваўчую работу ў 17 падшэфных школах, 4 домаўпраўленнях, на 2 заводах, 2 фабрыках, станцыі юнатаў. Толькі са студзеня месяца канцэртныя брыгады і мастацкія калектывы універсітэта далі для насельніцтва горада каля 30 канцэртаў, агітбрыгады правялі каля сотні лекцый. Камсамольцы універсітэта праводзяць сумесныя вечары адпачынку з рабочымі і служачымі.

У гэтым навучальным годзе камсамольцы універсітэта арганізавалі агульнападрыхтоўчыя курсы для 200 рабочых, правялі фізіка-матэматычную алімпіяду, працавалі ў школах юных фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў.

Вось ужо трэці год летам камсамольцы універсітэта дапамагаюць рабочым аўтазавода, дзе летам мінулага да 150 чалавек працавалі на працягу двух месяцаў у яго цэхах, летам гэтага года традыцыі дружбы з рабочымі ўзмацняцца яшчэ ў большай ступені. На аўтазаводзе будуць працаваць 200 чалавек. Штогод камсамол універсітэта выводзіць на вуліцы горада дасячы чалавек для яго добраўпарадкавання. Студэнты разбіваюць скверы, саджаюць дрэвы, вырошчваюць кветкі. Трэці год будуць працаваць камсамольцы на будоўлях горада Мінска.

У гэтым годзе горад атрымае яшчэ адзін студэнцкі стадыён, пабудаваны камсамольцамі універсітэта.

За гонар роднай сталіцы неаднаразова выступалі камсамольцы — майстры спорту. У мінулым годзе яны абаранялі гонар на V Усесаюзных студэнцкіх гульнях, у гэтым годзе яны будуць удзельнічаць у Спартакіядзе народаў СССР. Адзіны ў Саюзе студэнцкі шашачны клуб нашага універсітэта падрыхтаваў спартсменаў — чэмпіёнаў краіны. Такая вялікая работа моладзі ідзе ў падзяку за тое, што наша родная сталіца дала нам выдатныя аўдыторыі, лабараторыі, бібліятэкі, канцэртныя залы, кінатэатры, музеі, а галоўнае вучоных, якія рыхтуюць юнакоў і дзяўчат актыўнымі будаўнікамі камунізма.

М. ЦІВА,
сакратар камітэта камсамола.



МІНСК СПАРТЫЎНЫ. Фота В. АСТАПАВА.

900... 50... ТЫСЯЧЫ

Вы, напэўна, зразумелі што лічба 900—гэта ўзрост нашага горада. 50 — узрост нашай Савецкай Радзімы. А некалькі тысяч... Аб іх пойдзе гаворка.

За гады свайго існавання філалагічны факультэт Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна даў нашай краіне шмат вядомых дзеячоў навукі, літаратуры і культуры. Мы з гонарам успамінаем зараз іх імёны: віцэ-прэзідэнт АН БССР, вядомы пісьменнік Кандрат Крапіва, Лаўрэат Ленінскай прэміі, паэт Пятрусь Броўка, вядомыя пісьменнікі Іван Мележ, Іван Навуменка. У сценах універсітэта адукацыю атрымалі здольныя паэты Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, празаікі Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, Міхась Стральцоў, Георгі Шыловіч... І важна тое, што кожны з іх уносіць свой уклад у развіццё навукі, літаратуры і культуры.

Напярэдадні вялікіх дат: 900-годдзя нашага роднага горада, 50-годдзя Савецкай улады нам хочацца пажадаць гэтым некалькім тысячам выхаванцаў філалагічнага факультэта плённай працы, творчага натхнення, каб паўсядзённа памнажаліся слаўныя традыцыі БДУ імя У. І. Леніна.

П. ІВАНОВІЧ.

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Днямі ў адрас камітэта камсамола нашага універсітэта прыйшоў ліст ад студэнта падрыхтоўчага факультэта Марсела Кулунамі. Вось яго змест:

З вялікай прыемнасцю я звяртаюся да Вас ад імя студэнтаў падрыхтоўчага факультэта універсітэта з падзякай за тую велізарную дапамогу, якая была аказана нам у другім семестры бягучага года.

Такі вялікі клопат з Вашага боку, калі савецкія студэнты хімічнага, біялагічнага і матэматычнага факультэтаў арганізавалі дапамогу ў вучобе замежрым студэнтам, сімвалізуе цесныя вузы дружбы, якія аб'ядноўваюць нас. Я лічу іх карыснымі і непарушнымі.

Мы спадзяемся, што такая дапамога будзе і надалей аказвацца выпускнікам нашага факультэта.

Марсель КУЛУНАМІ,
член савета дружбы універсітэта.

НАДВЯЧОРАК НАД СВІСЛАЧЧУ.
Фотаэцюд А. КАДЗЕТА.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 13454. Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 206, тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 891.